# ЗОЛАТА РОДНАГА СЛОВА

**ВЯРЭЙКІ. 1 кастрычніка ў Вярэйкаўскім доме культуры (Ваўкавыскі раён) зладзілі святочную канцэртную праграму пад сімвалічнай назвай «Залатая пара». Перад аднавяскоўцамі выступіў член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Віктар Курловіч.**

Творчая імпрэза была прысвечана Дню пажылых людзей і прайшла ў рамках дэкады «Залаты ўзрост». …Без удзелу паэта-земляка не абыходзіцца ніводная культурная падзея ў аграгарадку. Зразумела, што паездкі па вобласці і рэспубліцы даюцца нашаму калегу ўжо не так лёгка, як раней. Тым не менш, сваёй актыўнай пазіцыі Віктар Георгіевіч не змяняе, – уважліва сочыць за тым, што адбываецца ў навакольным свеце, аналізуе і на ўсё адклікаецца ў радках сваіх вершаў. Публікацыі твораў сучаснага беларускага паэта па-ранейшаму можна сустрэць на старонках альманахаў, калектыўных зборнікаў і рэспубліканскага штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» («ЛіМ»). Паэт сур'ёзна захоплены мастацкім перакладам паэзіі рускіх калег на беларускую мову, з'яўляецца лаўрэатам Міжнароднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычнага перакладу «Берега дружбы» (Расія).

У святочнай канцэртнай праграме «Залатая пара» беларускі паэт Віктар Георгіевіч Курловіч сардэчна павіншаваў землякоў з Днём пажылых людзей, пажадаў здароўя і бадзёрасці духу на доўгія гады. Золата – гэта сімвал дастатку, гармоніі, поспеху, стабільнасці. Яно ўзвышае, надае сіл, упэўненасці, натхняе і акрыляе чалавечую душу. А яшчэ залаты – гэта колер спелай хлебнай нівы. Ветэранскі ўзрост – час падсумавання жыццёвых набыткаў – называюць залатым зусім невыпадкова. Невыпадкова пажылых людзей ушаноўваюць гэтай залатой парой. Да залатога колеру, у які восень афарбоўвае першыя кастрычніцкія дні, дадалося золата роднага беларускага слова, якім паэт адарыў аўдыторыю. У аўтарскім прачытанні прагучалі творы філасофскай і грамадзянска-патрыятычнай тэматыкі. Выдатны падарунак – беларускае мастацкае слова – сагрэла сэрцы людзей і асвяціла іх душы жыватворным святлом.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Віктар Курловіч удзельнічае ў канцэртнай праграме пад назвай «Залатая пара», прысвечанай Дню пажылых людзей. Вярэйкаўскі дом культуры, Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць. 1 кастрычніка 2023 года.



